# Раённыя БУДНІ

Грамадска-палітычная газета Пружанскага раёна

*Газета выдаецца з кастрычніка 1939 года* ■ *Кошт у розніцу дагаворны*

*22 ліпеня 2006 г., субота*
*№ 113-114 (8739-8740)*



"Гулливер"
Самая сучасная
МЭБЛЯ
ад лепшых вытворцаў Беларусі.
КУХНІ, СЦЕНКІ, ШАФЫ-КУПЭ, СПАЛЬНІ, ДЗІЦЯЧЫЯ, ПРЫХОЖЫЯ, КАМП'ЮТЭРНЫЯ СТАЛЫ, ДЗВЕРЫ металічныя і інш.
Камп'ютэрны дызайн.
Тэл. 8-029-365-42-06, 365-41-99
Ювелірны магазін па вул. Шырмы

Строй материалы | Бытовая техника
ТОЧКА
г. Пружаны, ул. Г. Ширмы, рынок "Салют"
ГОРОД: 95-4-00
VELCOM: 3-98-96-97
МТС: 582-2-582
Пн.-пт. с 9-00 до 19-00
сб.-вс. с 9-00 до 16-00


## КАБ ВЕДАЦЬ І ШАНАВАЦЬ

Галіна КАЛЯДА,
Аляксандр МЕЛЕШ (фота)

**«Вайна для нас не скончылася, пакуль не пахаваны апошні салдат». Кіруючыся гэтым прынцыпам, і прыбылі ў наш раён ваеннаслужачыя 52 асабнага спецыялізаванага батальёна для ўстанаўлення няўлічаных пахаванняў гадоў Вялікай Айчыннай вайны.**

Група ваеннаслужачых з сямі чалавек прыступіла да раскопак сёмага ліпеня. Працавалі ў пасёлку Інтэрнацыянальны. Як і чакалася, пад магільным узгорачкам знайшлі астанкі чырвонаармейца. А праз дзесяць дзён зазвінелі рыдлёўкі ў в.Куплін. Па звестках старажыла в.Круглае В.К.Чыжа, там пахавана больш 40 чырвонаармейцаў, якія служылі на аэрадроме каля вёскі і загінулі ў самым пачатку вайны.

—Звесткі пра пахаванне пацвердзіліся,— кажа камандзір узвода старшы лейтэнант Павел Галецкі.

Праверка на наяўнасць выбухованебяспечных прадметаў паказала, што такіх на месцы пахавання няма. На момант нашага прыезду салдаты тэрміновай службы эксгуміравалі астанкі байцоў Чырвонай арміі. Былі падняты астанкі 11 чалавек, знойдзены лыжкі і гузікі ад вайсковай формы. На думку вышукоўцаў, гэта далёка не ўсе пахаваныя ў 1941 годзе ля вёскі Куплін чырвонаармейцы.

—Не, ні страху, ні грэблівасці няма,— расказваюць салдаты (на здымку). —Наадварот, гэта інтрыгуе. Вельмі цікава знайсці асабістыя рэчы воінаў. А калі ўдаецца ўстанавіць імя загінуўшага, гэта — самая каштоўная знаходка.

За чатыры гады раскопак на рахунку старшага лейтэнанта Паўла Галецкага каля пяцідзесяці выяўленых пахаванняў. І самы памятны выпадак быў у Светлагорскім раёне, калі на месцы пахавання былі знойдзены адразу два медалі «За адвагу» і «За баявыя заслугі». Па іх і былі ўстаноўлены загінуўшыя.

Раскопкі працягваюцца. Па завяршэнні работ астанкі загінуўшых воінаў будуць перапахаваны з усімі ўшанаваннямі.





## НАШЫ САДЫ — НАША БАГАЦЦЕ

Мікола АРХУЦІК

Для нашай краіны развіццё садаводства мае стратэгічнае значэнне. Прынята на дзяржаўным узроўні і адпаведная праграма на 2006 — 2010 гады. Згодна з ёй, у рэспубліцы павінны быць закладзены новыя сады інтэнсіўнага тыпу, арганізавана вытворчасць пасадачнага матэрыялу. Будзем спадзявацца, што з рэалізацыяй гэтай праграмы мы зменшым увоз у краіну імпартнай садавіны і агародніны. Наш рынак насычаны польскай, малдаўскай і галандскай садавінай.

Праўда, нельга не заўважаць і таго, што вакол Пружан закладваюцца новыя сучасныя сады інтэнсіўнага тыпу. Узорамі для пераймання могуць служыць сады абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі, ААТ «Айчына», фермерскай гаспадаркі «Тытул-Агра».

Садаводы знаходзяцца пакуль у пошуку і вымушаны пастаянна вучыцца. Так, менавіта вучыцца на прыкладзе іншых.

Нядаўна ў нашым раёне на базе абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі прайшоў семінар для фермераў «Сучаснае садаводства». На яго былі запрошаны кіраўнікі фермерскіх гаспадарак як з нашай вобласці, так і з Гомельшчыны і Міншчыны. Займаўся з фермерамі кансультант Ваўтэр ван Тэйфелен з Галандыі.

Серыя вучэбных тураў з прыцягненнем галандскіх спецыялістаў дагэтуль прайшла ў Гродзенскай, Мінскай і Віцебскай абласцях. Ажыццяўляецца вучоба фермераў у рамках праекта «Матра» Міністэрства замежных спраў Галандыі «Дапамога беларускім фермерам і беларускаму грамадскаму аб'яднанню фермераў».

Праграма семінара ўключала тэарэтычную і практычную часткі. Госць з Галандыі азнаёміў прысутных з асноўнымі напрамкамі развіцця садаводчага сектара сваёй краіны. У прыватнасці, ён паведаміў, што ў Галандыі ўжо даўно выкарыстоўваюць пры закладцы садоў пасадачны матэрыял, атрыманы на бязвіруснай аснове. Шчыльнасць пасадкі ў садах складае 3 — 4 тысячы дрэўцаў на гектар. Гэта дае магчымасць атрымаць з аднаго гектара ў сярэднім па краіне 48 тон яблыкаў. У асобных фермераў гэта лічба дасягае 75 тон.

Сады ў Галандыі закладваюцца абавязкова з арашэннем, прычым як з падкронавым, так і надкронавым. Для ўборкі пладоў выкарыстоўваюцца спецыяльна прызначаныя для гэтых мэтаў камбайны.

Сярэдняя плошча фермерскіх садоў у краіне складае 10 — 12 гектараў. Няма праблем і з рэалізацыяй вырашчанай прадукцыі. Гэтай справай займаюцца ў Галандыі іншыя арганізацыі.

Практычная частка заняткаў семінара прайшла ў плодагадавальніку і вытворчым садзе абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі. Ваўтэр ван Тэйфелен азнаёміў яго ўдзельнікаў з найбольш важнымі элементамі тэхналогіі інтэнсіўнага садаводства з высокай шчыльнасцю пасадкі. Госць надаваў увагу фарміраванню кроны пладовага дрэва. Каб правільна зрабіць абрэзку дрэўца, трэба мець адпаведную тэарэтычную і практычную падрыхтоўку.

Засяродзіў увагу фермераў госць з Галандыі і на такіх пытаннях, як якасць пасадачнага матэрыялу і эканоміка садаводства. Асноўная мэта, якую перад сабой павінен ставіць фермер,— атрыманне прыбытку. Таму, як падкрэсліў замежны спецыяліст, усё трэба лічыць. Садавод павінен быць яшчэ і добрым эканамістам.

Наведаў Ваўтэр ван Тэйфелен і сад фермерскай гаспадаркі «Тытул-Агра», якую ўзначальвае Сяргей Глушчанка. Першыя саджанцы тут былі высаджаны толькі вясной мінулага года. Госць з Галандыі даў высокую ацэнку таму, што ўжо зроблена ў фермерскім садзе. Але і падкрэсліў: каб дасягнуць галандскіх стандартаў, яшчэ трэба многаму вучыцца. Што, дарэчы, і робіць Сяргей Глушчанка. Пасля наведвання Галандыі, ён шмат з убачанага ўжо ўкараніў у сваім садзе. І гэта на перспектыву павінна прынесці свой плён. А ўсе мы будзем спадзявацца, што ўжо зусім хутка настане час, калі замест малдаўскіх або польскіх яблыкаў на прылаўках нашых магазінаў будуць красавацца мясцовыя — пружанскія.

***НА ЗДЫМКУ:** кансультант па садаводству з Галандыі Ваўтэр ван Тэйфелен у садзе фермерскай гаспадаркі «Тытул-Агра».*
***Фота Аляксандра МЕЛЕША.***

## Што? Дзе? Калі?

********************

**Праваслаўны прыход Свята-Пакроўскай царквы (в.Руднікі)**

запрашае на ўрачыстае богаслужэнне з нагоды ПРЫБЫЦЦЯ Ў ХРАМ ЧАСЦЕЙ СВЯТЫХ МОШЧАЎ **лекара Панцеляімана, вялікамучаніка Георгія Пабеданосца, вялікамучаніцы Кацярыны і мучаніка Трыфана,**

якое адбудзецца 29 ліпеня, у суботу.

*Пачатак богаслужэння ў 8.00 гадзін.*
*Часці мошчаў будуць знаходзіцца ў храме в.Руднікі да 15.00 гадзін.*


**в БРЕСТ за КОВРАМИ !!**
**— на бульвар Шевченко, 8 в магазин «КОВРЫ»**
**— на строительный рынок в ПАВИЛЬОН № 156**
по ул. Карьерной, 12/1
САМЫЙ ШИРОКИЙ АССОРТИМЕНТ
в г. Бресте и Брестской области
**КОВРОВЫЕ ПОКРЫТИЯ, ДОРОЖКИ, КОВРЫ**
От самых дешевых – 10 тыс. за 1 метр кв.

ТОЛЬКО МЫ **оверлуем** любое ковровое изделие за 10 минут в Вашем присутствии. Широкая цветовая гамма нитей. Стоимость 1 метра строчки – 1000 руб.

ТОЛЬКО МЫ **вырежем** любые нужные Вам размеры покрытий. Вы не оплачиваете остающиеся после разреза куски.

ТОЛЬКО МЫ продадим Вам ковровые изделия **в кредит** по паспорту без дополнительных справок. Товары в кредит по розничным ценам. Услуга бесплатная и кредит без процентов для всех жителей Брестской области.

**Предприятия и организации! Обновите свои кабинеты!**
**Дешево! Безналичный расчет.**
**Тел. (8-0162) 22-01-17, (8-029) 626-55-07**